Мясцовая беларуская газета. Выдаецца ў Смаргоні з 23 лістапада 1944 года.

# Рукатворцы памяці



Мастакі-скульптары Анатоль АРЦІМОВІЧ, Уладзімір ЦЕРАБУН, Іван АРЦІМОВІЧ.

Як вядома з ранейшых публікацый нашай газеты, у 2006 годзе па ініцыятыве райвыканкама быў аб'яўлены і праведзены конкурс на стварэнне эскізнага праекта мемарыяльнага комплексу па лініі супрацьстаяння на Смаргоншчыне расійскай і нямецкай армій у Першую сусветную вайну. На конкурс было прадстаўлена 9 праектаў. Пераможцам выйшаў творчы калектыў мастакоў-скульптараў пад кіраўніцтвам прафесара Акадэміі мастацтваў, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Анатоля Арцімовіча, у складзе якога працуе і наш таленавіты зямляк, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, скульптар Уладзімір Церабун.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

10-11 ноября 2012 года
в г. Сморгони
с 10-00 до 17-00
будет проводиться
специализированная ярмарка
«Рыба Беларуси»

Приглашаем всех

Приглашаем в салон



■ ГІСТОРЫЯ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ

# Рукатворцы памяці

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

У студзені 2007 года пасля далейшай распрацоўкі праект мемарыяльнага комплексу быў прадстаўлены Рэспубліканскаму мастацка-экспертнаму савету па манументальнаму і манументальна-дэкаратыўнаму мастацтву. Савет адобрыў прапанаваную канцэпцыю і праз пэўны час разгледзеў і прыняў да выканання ўжо канчатковы варыянт праекта мемарыяльнага комплексу. З бюджэту Саюзнай дзяржавы было выдзелена каля 2-х мільярдаў рублёў на выкананне творчай часткі работы і адліўку скульптурных кампазіцый з бронзы.

У 2009-м годзе гэта работа была закончана, скульптурныя кампазіцыі прывезены ў Смаргонь.

Інстытут "Гроднаграмадзянпраект" распрацаваў праектна-каштарысную дакументацыю на будаўніцтва мемарыяла. Дзякуючы вопытнаму архітэктару, кіраўніку праектнай майстэрні Аляксандру Захарчуку праект быў не толькі "прыземлены" на мясцовасці, але і атрымаў далейшую творчую распрацоўку.

А зусім нядаўна ў парку Перамогі па вуліцы Камінскага распачалася расчыстка пляцовак і вертыкальная планіроўка цэнтральнай алеі будучага мемарыяла.

- У Беларусі наогул нямнога помнікаў, прысвечаных падзеям і людзям Першай сусветнай вайны, - расказвае Уладзімір Церабун. - Гэтыя помнікі і абеліскі створаны на аматарскім узроўні. А вось на ўзроўні дзяржаўным такі праект, як мемарыяльны комплекс у Смаргоні, ажыццяўляецца ўпершыню. Значыць ёсць грамадскае разуменне важнасці і неабходнасці ўзнаўлення амаль што забытай старонкі з гісторыі Беларусі. І мы, сучаснікі і нашчадкі нашы, павінны ведаць і помніць тое жахлівае ліхалецце роднага краю, тую жудасную праўду крывавай, бязлітаснай бойні...

І нельга тут не пагадзіцца з Уладзімірам Васільевічам. Бо сапраўды, на жаль, і да цяперашняга часу гісторыя Першай сусветнай вайны на беларускай тэрыторыі даследавана вельмі павярхоўна, хаця менавіта беларуская зямля стала адным з галоўных тэатраў тагачасных ваенных дзеянняў. Па тэрыторыі нашай краіны ў сучасных межах праходзіў расійска-германскі фронт, дзе з абодвух бакоў узброена супрацьстаялі 2,5 мільёна чалавек. У расійскую армію было мабілізавана больш як 800 тысяч нашых суайчыннікаў, і амаль кожны восьмы з іх загінуў на франтах той вайны. Па няпоўных звестках, каля 1,5 мільёна жыхароў Беларусі сталі прымусовымі бежанцамі і былі расселены на тэрытоыі Расійскай імперыі. І амаль паўмільёна з іх так і не вярнуліся на сваё ранейшае жыхарства, назаўсёды засталіся там.

А душы іх, нявінна паўшых і памёршых, час ад часу пакідаюць неба і вяртаюцца сюды, дзе людзі нарадзіліся, дзе ўпершыню спазналі цяжкасці і радасці жыцця зямнога. Яны наведваюцца, каб паглядзець на нас і нашы справы, каб спэўніцца, ці правільна жывём, ці годна паводзім сябе, ці шануем святыні, дадзеныя Богам.

Яны прыходзяць і сюды, у парк Перамогі, дзе распачата высакародная справа ўваскрашэння і ўшанавання памяці і славы, гераізму і трагізму мільёнаў дачасна загінуўшых. Увасобленыя ў бронзу і граніт патрыётамі-сучаснікамі, рукатворцамі памяці, яны паўстануць тут і будуць дакорліва глядзець на нас, і будзе выразна чутна іх перасцярога: людзі, будзьце пільнымі!

Іван ЛАЗУТА

СМОРГОНСК

ОБ УСТАНОВ... ОБЩ...

На основании пос... ры и строительства Ре... №28 «О предельных н... гося с государственн... ный исполнительный ...

Установить с 1 сен... ящихся с государствен... ределения размера лы...

Показатели ...

| Тип жилых до... |
|---|
| Жил. дома энергоэффек... проектов |
| Объекты строительства: |
| «Застройка микрорайона... в г.Сморгони. 40-квартирн... по ул.Я.Коласа. Позиция... по генеральн. плану № 3... |
| «Застройка микрорайон... в г.Сморгони. 49-квартир... по ул. Я.Коласа. Позици... по генеральному плану ... |
| Индивидуальные жилые... |
| город |
| село |
| город |
| село |
| Индивид. жил. дома, стр... осущ. хоз. способом мно... |
| каркасно-щитовые: |
| город |
| село |
| со стенами из газосили... кирпича и др. штучных ... |
| город |
| село |
| со стенами из бруса: |
| город |
| село |
| Индивид. жил. дома, ст... осущ. подряд. способом ... |
| каркасно-щитовые: |
| город |
| село |
| со стенами из газосил... кирпича и др. штучных ... |
| город |
| село |
| со стенами из бруса: |
| город |
| село |

СМОРГОНСК...

ОБ УСТАНОВ...